УДК 37.072.2:2(476)

**Н. В. Собаль**
*Джяржаўная ўстанова адукацыі «Гімназія № 1 г. Баранавічы», г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# ВЫХАВАННЕ: СВЕЦКАЕ ПА ФОРМЕ, ДУХОЎНАЕ ПА ЗМЕСЦЕ

**Уводзіны.** Сучаснае пакаленне дзяцей можна назваць «пакаленнем лічбавай эры». Яны атрымліваюць адукацыю з дапамогай Інтэрнэту, інтэрактыўных платформаў і мультымедыйных рэсурсаў. Лічбавыя тэхналогіі становяцца не толькі інструментам навучання, але і асноўнай прасторай, у якой адбываецца фарміраванне асобы. У такіх умовах асаблівую актуальнасць набывае захаванне і ўмацаванне традыцыйных духоўна-маральных каштоўнасцей як асновы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця ўласнай годнасці і патрыятызму.

Безумоўна, займацца выхаваннем, далучаць дзяцей да агульначалавечых каштоўнасцей ніякая тэхніка ці штучны інтэлект не зможа. Адказнасць за выхаванне падрастаючага пакалення ў нашым грамадстве ўскладваецца на бацькоў і педагогаў. Паўстае пытанне аб тым, якую ролю адыгрывае праваслаўная культура ў сістэме сучаснага свецкага выхавання і як пазбегнуць фармалізма ў рабоце настаўніка, дамапагчы бацькам захаваць аўтарытэт сямейнага выхавання.

Мэтай выхавання ў сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь з’яўляецца фарміраванне рознабакова развітой, маральна сталай, творчай асобы навучэнца. Выхаванне грунтуецца на агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцях, культурных і духоўных традыцыях беларускага народа, дзяржаўнай ідэалогіі, адлюстроўвае інтарэсы асобы, грамадства і дзяржавы. Адным з асноўных складнікаў выхавання з’яўляецца духоўна-маральнае выхаванне, накіраванае на далучэнне навучэнцаў да агульначалавечых і гуманістычных каштоўнасцей, фарміраванне маральнай культуры [1].

Нягледзячы на свецкі лад жыцця нашага грамадства, супрацоўніцтва Міністэрства адукацыі і Беларускай Праваслаўнай Царквы (БПЦ) інтэнсіфікуецца з падпісання ў 2003 годзе «Соглашение

© Собаль Н. В., 2026

о сотрудничестве между Республикой Беларусь и Белорусской Православной Церковью». На дадзены момант дзейнічае Праграма супрацоўніцтва паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой на 2020—2025 гады. Супрацоўніцтва рэгулюецца заканадаўствам, у тым ліку абноўленым Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, і арыентавана на рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі і духоўна-маральнага развіцця.

Каб сфарміраваць духоўныя каштоўнасці сучасных вучняў недастаткова адной свецкай адукацыі, таму што веды самі па сабе не фарміруюць сумленне, а інфармацыя — не заўсёды ператвараецца ва ўнутраную ўстаноўку. Свецкая адукацыя забяспечвае інтэлектуальнае развіццё і асэнсаванне свету, але для фарміравання маральнай пазіцыі, эмпатыі, павагі да іншых, адказнасці за свае словы і ўчынкі неабходна актыўнае выхаванне — узаемадзеянне з узорамі дабра, спадчынай беларускага народа, жывымі прыкладамі міласэрнасці, шчырасці, сямейнай любові і грамадзянскай пазіцыі.

**Асноўная частка.** На працягу ўсёй чалавечай гісторыі людзі імкнуцца да камфорту, дзе матэрыяльныя каштоўнасці часта атаясамліваюцца са шчасцем як душэўным, так і цялесным. Цяпер пад паняццем камфорту ў наша жыццё актыўна ўкараняюцца розныя тэхналогіі. Чалавек нават не заўважае ўзроўню залежнасці ад іх, але разнастайнасць гаджэтаў забірае ў чалавека самае каштоўнае — час і ўвагу, навыкі працы, а з укараненнем LLM (Large Language Model) і некаторыя свае кагнітыўныя функцыі [2]. Тэхналогіі не могуць даць адказ на многія пытанні, а толькі звужаюць мысленне і розум. Калі ж гаворка ідзе пра падрастаючае пакаленне, то сітуацыя пагаршаецца тым, што з павелічэннем колькасці гаджэтаў, якія спрашчаюць жыццё, з’яўляецца праблема правільнай арганізацыі вольнага часу вучняў. Калі бацькі не ўдзяляюць патрэбнай увагі, то камп’ютарныя гульні і сацыяльныя сеткі пачынаюць значна ўплываць на фарміраванне асобы дзіцяці, у тым ліку і негатыўна [2—4]. Сучасныя псіхолагі проста пішуць аб масавай дыджыталізацыі сучаснага грамадства і псіхалагічнай залежнасці ад гаджэтаў [4].

Духоўна-маральнае выхаванне дзяцей і моладзі ўключае ў сябе патрыятызм, грамадзянскасць, сямейныя каштоўнасці, любоў да роднага краю, фарміраванне здаровага ладу жыцця і адмову ад шкодных звычак. Гэты працэс з'яўляецца асновай для фарміравання асобы,

паколькі духоўнасць і маральнасць выступаюць як найважнейшыя базісныя характарыстыкі чалавека.

Калі разглядаць існасць чалавека як спалучэнне прыроднага, сацыяльнага і духоўнага, духоўнасць зусім не тоеснае паняцце да рэлігійнасці. Духоўнасць — гэта імкненне да сэнсу, сумлення, адказнасці, спагады, культурнай ідэнтычнасці. Рэлігійнасць — гэта ўласцівасць або стан чалавека, якая характарызуе яго як верніка, які прытрымліваецца пэўнай рэлігійнай традыцыі, цвёрдага ў сваёй рэлігійнай веры.

Адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь як мэтанакіраваны працэс навучання і выхавання, які ажыццяўляецца на прафесійнай аснове спецыяльна падрыхтаванымі людзьмі, мае свецкі характар. Выхаванне прадугледжвае арганізацыю дзейнасці вучняў, у ходзе якой фарміруюцца каштоўнасці, светапогляд, асабістыя якасці. Кожная гістарычная эпоха выбудоўвала такую сістэму адукацыі, якая не толькі абапіралася на дасягнуты да гэтага часу ўзровень ведаў, але і адпавядала мэтам развіцця грамадства [5; 6].

Гістарычна склалася, што хрысціянства на Беларусі мае тысячагадовую гісторыю. І яно непасрэдна звязана з адукацыяй і развіццём беларускай культуры і ментальнасці. Напрыклад, асноўнай пісьмовай крыніцай гісторыі беларускай мовы з'яўляецца рукапісная кніга. Асноўная маса старажытнаўсходнеславянскіх рукапісных кніг — гэта спіскі тэкстаў стараславянскага паходжання, галоўным чынам хрысціянская багаслужэбная літаратура з набору кніг для правядзення богаслужэння [7].

У гісторыі нашага народа ёсць слаўныя імёны, якія праз пакаленні даюць нам прыклад. Прападобная Ефрасіння Полацкая прыкладала вялікія намаганні, каб спыніць братазабойчыя войны, садзейнічала асвеце і замацаванню на Беларусі праваслаўнай веры [8]. Асветнікам і першадрукаром Ф. Скарынам кіравала ідэя — не толькі даць народу займальнае чытанне, але і імкненне да распаўсюджвання адукацыі і асветы ў родным краі. У прадмове да «Псалтыра» ён гаворыць, што яго кнігу можна скарыстоўваць пры навучанні грамаце: «детем малым початок всякое доброе науки, дорослым помножение в науце, мужем моцное утвержение…» [9, с. 62].

Таму, калі мы зараз гаворым аб свецкім па змесце выхаванні, то варта ўлічваць, што ў Беларусі адносіны дзяржавы і рэлігійных арганізацый будуюцца на аснове прынцыпаў свабоды сумлення,

неўмяшальніцтва дзяржаўных органаў у дзейнасць рэлігійных арганізацый і ў той жа час на аснове прызнання дзяржавай значнага ўкладу БПЦ у станаўленне беларускай дзяржаўнасці, развіццё нацыянальнай культуры і ў зацвярджэнне духоўна-маральных каштоўнасцей у грамадстве. Гэтыя ідэі складаюць аснову свецкай дзяржавы і маюць асобае значэнне для Рэспублікі Беларусь, краіны шматнацыянальнай і поліканфесійнай. Гэта значыць, што духоўна-маральныя каштоўнасці прывіваюцца ў рамках свецкай (нерэлігійнай) адукацыі, не выкарыстоўваючы рэлігійныя догмы, але абапіраючыся на агульначалавечыя і агульнанацыянальныя каштоўнасці, такія як абавязак, справядлівасць, патрыятызм і моцная сям’я.

На прыкладзе адукацыйнай дзейнасці ў ДУА «Гімназія № 1 г. Баранавічы», адзначым, што ў працэсе выкладання беларускай мовы і літаратуры, а таксама вопыце класнага кіраўніцтва (настаўнік Н. В. Собаль), пераважным з’яўляецца прынцып інклюзіўнасці: праява павагі да розных светапоглядных (у тым ліку і рэлігійных) пазіцый вучняў і іх сем’яў. Выхаваўчы патэнцыял твораў, прадугледжаных праграмай, і дыдактычны матэрыял выкарыстоўваецца, не прыгнятаючы іх перакананні. Універсальным прадстаўляецца краязнаўчы матэрыял. Вучням неабходна паказаць, што аўтар ва ўласным творы паказвае сваю рэчаіснасць, важна прыйсці да высновы, што праваслаўныя маральныя законы і каштоўнасці беларускага народа тоесныя.

На жаль, з развіццём інфармацыйных тэхналогій, усё больш негатыўных фактараў уплывае на фарміраванне асобы сучаснага вучня. Пачынаючы з відэагульняў і заканчваючы зместам кантэнту разных сацыяльных сетак, віртуалізацыя свядомасці асобы непаўналетняга з «мяккай» і «абессэнсоўваючай» мадэлямі светапогляду пераўтварае іх у пасіўных спажыўцоў, якіх лёгка праграмаваць з дапамогай спецыяльных інтэрнэт-тэхналогій. Вучні, якія маюць ужо сфарміраваную светапоглядную мадэль знаходзяцца пад меншым уплывам маніпулятыўных інфармацыйных патокаў «лічбавага асяроддзя». Таму мэтай свецкага по форме выхавання лічу фарміраванне ў чалавека ўнутранага маральнага стрыжня, які дапамагае яму арыентавацца ў жыцці і прымаць адказныя рашэнні.

У ДУА «Гімназія № 1 г. Баранавічы» паспяхова ажыццяўляецца план супрацоўніцтва з прыходам храма святога дабравернага князя Аляксандра Неўскага г. Баранавічы. Сярод накірункаў сумеснай працы гімназіі і прыхода можна вызначыць мерапрыемствы па

патрыятычнаму выхаванню і краязнаўчай рабоце, развіццю мастацкіх і творчых здольнасцей навучэнцаў, прафілактыку брыдкаслоўя і суіцыдальных паводзін, а таксама мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне здаровага ладу жыцця, захаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцей, недапушчэнне ўцягвання навучэнцаў у дэструктыўныя і незарэгістрыраваныя арганізацыі рэлігійнай накіраванасці. Трэба адзначыць, што мы стараемся задзейнічаць не толькі навучэнцаў, але і бацькоў, педагагічных работнікаў.

Мерапрыемствы па рэалізацыі плана супрацоўніцтва ажыццяўляюцца як на базе нашай гімназіі, так і на базе прыхода храма. Вопыт паказаў, што самымі эфектыўнымі формамі працы з'яўляецца наведванне класных і інфармацыйных гадзін іерэем нашага прыхода. Такія сустрэчы заўсёды тэматычныя, але вучні могуць задаваць любыя пытанні. Таксама навучэнцы з задавальненнем удзельнічаюць у конкурсах дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Калядная зорка», «АрхНовация», дабрачынных акцыях «Цуды на Каляды», «Дарогай дабра», «Нашы дзеці». Вучні старэйшых класаў прымаюць удзел у гарадскім конкурсе творчых і даследчых работ. Арганізоўваючы мерапрыемства таго ці іншага фармату, мы абавязкова запрашаем ўсіх жадаючых, а потым інфармацыю размяшчаем на сайце гімназіі, у сацыяльных сетках. Гэта дазваляе тактоўна завабіць ў выхаваўчы працэс і вучняў, і бацькоў.

Немалаважную ролю адыгрывае і гімназічная бібліятэка, у шосты школьны дзень бібліятэкары збіраюць сваіх чытачоў на цікавыя мерапрыемствы. Сярод іх можна вызначыць літаратурныя гасцёўні, дзе дзеці знаёмяцца з праваслаўнай літаратурай; архіўныя майстэрні («Пісьмо з фронта: работа з копіямі ваенных кніг»); экалагічныя выставы («Экоhero: выратуй планету з кнігай»); майстар-клас «Ствараем сямейны альбом»). За апошія два гады наша бібліятэка папоўнілася выданнямі часопіса «Ступени», іншымі праваслаўнымі выданнямі, дзякуючы намаганням іерэя Рамана Бародзіча.

Вучні 6—7 класаў на факультатыўных занятках «Асновы духоўна-маральнай культуры і патрыятызму» цікавяцца гісторыяй горада, удзельнічаюць ў розных мерапрыемствах і сустрэчах патрыятычнай накіраванасці. У ДУА «Гімназія №1. г. Баранавічы» аформлена ў фае трэцяга паверха экспазіцыя «Беларусь памятае». Валанцёры гімназіі таксама ажыццяўляюць догляд мемарыяльнага комплексу «Урочышча Гай», у якім у канцы чэрвеня 1942 года расстралялі каля

3 тысяч чэхаславацкіх грамадзян. Рэалізуецца праект «Аб памятніках гісторыі і культуры г. Баранавічы», паводле якога за гімназіяй замацаваны магілы Герояў Савецкага Саюза.

Нельга пакінуць па-за ўвагай выхаваўчы патэнцыял ўрока. Ніякі школьны прадмет не падрыхтуе так вучня да самастойнага жыцця, з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, сапраўдага патрыёта, як літаратура. На ўроках матэматыкі, фізікі, хіміі і біялогіі настаўнікі вучаць прымяняць розныя ўменні на практыцы, па-за ўвагай застаецца духоўнае жыццё. Многія не разумеюць сапраўднага прызначэння сям'і, шчырая любоў да Радзімы замяняецца на грамадзянскі абавязак (а любоў нельга навязаць), нават губляецца разуменне значэння свят і іх традыцый і сімвалаў.

У 5 класе на ўроку пазакласнага чытання мэтазгодна азнаёміцца з апавяданнем М. Зарэмбы «Арэхавы спас», у 6 класе — з вершам А. Пісьмянкова «Продкі», у 7 класе — апавяданнем З. Бядулі «На Каляды к сыну», у 8 класе — вершам А. Вярцінскага «Жыццё даецца, каб жыццё тварыць…», у 9 класе ў раздзеле «Чалавек і грамадства. Постаці айчыннай гісторыі ў беларускай літаратуры» падаць «Жыціе Ефрасінні Полацкай». Нельга абысці ўвагай літаратурныя творы Я. Брыля, У. Караткевіча, В. Быкава, Г. Марчука, А. Дударава, якія ў сваёй творчасці звярталіся да хрысціянскіх матываў. Вучні гімназіі маюць вопыт удзелу ў літаратурных конкурсах праваслаўнага накірунку(напрыклад, Міжнародны анлайн-конкурс літаратуры, музыкі, метадычных матэрыялаў «Багародзіцы пахвалу ўспаём»).

Роля педагога заключаецца не ў прапагандзе канкрэтнага веравызнання. Настаўнік з'яўляецца носьбітам і перадатчыкам культурных каштоўнасцей праз асабісты прыклад, дыялог, рэфлексію. Для выключэння магчымых цяжкасцей становіцца неабходным актывізаваць працу рэсурсных цэнтраў па духоўна-маральнаму і патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў, каб іх дзейнасць была накіравана на ўкараненне ў практыку эфектыўнага вопыту выхавання, у тым ліку з удзелам прадстаўнікоў БПЦ; арганізацыю павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў па гэтым напрамку; аказанне кансультацыйнай дапамогі педагагічным работнікам.

Цяжка не пагадзіцца з ідэяй, выказанай галоўным рэдактарам часопіса «Ступени» протадыяканам П. Бубновым у адным з артыкулаў («Плён адзінства»): «Творца гэтага свету стварыў чалавечы

род для ўзаемаўзбагачальных зносін і плённай творчай працы. Розным людзям Гасподзь дае розныя дары, каб мы служылі адзін аднаму сваімі здольнасцямі, дзяліліся ведамі і, у добрым сэнсе гэтага слова, залежалі адзін ад аднаго» [10, с. 2].

**Заключэнне**. Такім чынам улічваючы вышэйпададзенае, адзначым, што сучасныя вучні, нягледзячы на сацыяльную дыджыталізацыю, якая ўвесь час пашыраецца, шчыра імкнуцца ведаць і разумець гісторыю свайго народа, здольныя мадэляваць свае паводзіны ў розных сітуацыях, маюць магчымасць далучыцца да духоўна-маральных каштоўнасцяў, перададзеных нам славутымі продкамі. Выхаванне ў школе сёння — гэта толькі пачатак маральнасці будучай асобы. На нашу думку, духоўнае выхаванне з'яўляецца не проста часткай адукацыі, а выступае яго фундаментам. Духоўны і маральны патэнцыял праваслаўя як традыцыйнай для Беларусі канфесіі, валодае неабходным патэнцыялам для выхавання падрастаючага пакалення высокамаральным, высакародным, сумленным.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. Кодекс Республики Беларусь об образовании : по состоянию на 1 сент. 2025 г. — Мн. : Национ. центр законодательства и правовой информации Респ. Беларусь, 2025. — 528 с.1.
2. *Ларше, Ж.-К.* Обратная сторона новых медиа / Ж.-К. Ларше ; пер. с фр. С. А. Кузнецовой. — М. : Изд-во Сретенск. монастыря, 2023. — 304 с.
3. *Бубнов, П., протодиакон.* Всё будет хорошо или как пережить трудности / протодиакон П. Бубнов // Ступени. — 2025. — № 2. — С. 32.
4. *Монтаг, К.* Новые боги. Как онлайн-платформы манипулируют нашим выбором и что вернет нам свободу / К. Монтаг ; пер. с нем. Е. Токовининой. — М. : Индивидуум Принт, 2023. — 338 с.
5. *Дятлов, Д.* Человек безбожный. Что такое грех и каковы его последствия? / Д. Дятлов // Ступени. — 2025. — № 2. — С. 10.
6. *Землякоў, Л. Я.* Рэлігія і адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь / Л. Я Землякоў, М. С. Шчокін // Полымя. — 2010. — № 7. — С. 107—118.
7. Духовное, нравственное и культурное значение православия в обновлении образования : сб. докладов IV Свято-Ефросиньевских педагогич. чтений / сост. С. А. Дейко. — Мн. : НМЦентр, 1998. — 160 с.
8. *Гайрылавец, Л. У.* Духоўная спадчына Беларусі (IX—1569 г.) / Л. У. Гаўрылавец, М. М. Мязга, Т. М. Сымановіч. —Мн. : Нац. ін-т адукацыі, 2023. — 200 с.
9. *Подокшин, С. А.* Скорина и Будный / С. А. Подокшин. — Мн.: Наука и техника, 1974. — 176 с.
10. *Бубнов, П., протодиакон.* Плоды единства / протодиакон П. Бубнов // Ступени. — 2024. — № 4. — С. 2.